

# Дагрукацца да кожнага

**29 верасня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры, на якім абмяркоўваліся стан і перспектывы развіцця культурна-асветных устаноў рэспублікі — музеяў, бібліятэк і арганізацый клубнага тыпу.**

Сярод разгледжаных пытанняў — аналіз развіцця сеткі ўстаноў культуры, кадры, матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў, культурнае абслугоўванне насельніцтва, у тым ліку ў сельскіх населеных пунктах.

З дакладам на пасяджэнні калегіі выступіла начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Ірына Карповіч, чыё выступленне выклікала дыскусію, у рамках якой прадстаўнікі рэгіёнаў і кіраўнікі арганізацый абмяняліся думкамі па абмеркаванай тэматыцы. Аб праведзенай рабоце па выкананні нарматываў забяспечанасці аграгарадкоў Мінскай вобласці арганізацыямі культуры і мерах, якія прымаюцца па замацаванні маладых спецыялістаў на месцах, далажыла начальнік галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Ала Шахоцька. Акрамя таго, аб арганізацыі кантролю за работай устаноў культуры Гомельскай вобласці, у тым ліку па выкананні заканадаўства аб арганізацыі дасугавай дзейнасці непаўналетніх, расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Дзяніс Язерскі. Таксама разглядалася пытанне аб метадычным суправаджэнні дзейнасці культурна-асветных устаноў.